Весці БДПУ. Серыя 2. 2022. № 4. С. 20-24

УДК 766-032.5

# ГРАФІЦІ ПАЎДНЁВА-ЎСХОДНЯГА СЛУПА ПОЛАЦКАЙ СПАСА-ПРААБРАЖЭНСКАЙ ЦАРКВЫ

**І. Л. Калечыц,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

Паступіў у рэдакцыю 29.09.22.

UDC 766-032.5

# GRAFFITI OF SOUTH-EASTERN PILLAR OF THE POLOTSK TRANSFIGURATION CHURCH

**I. Kalechyc,**
*PhD in History, Associate Professor of the Department of General History and Methods of Teaching History, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Received on 29.09.22

У артыкуле разглядаюцца графіці, якія лакалізаваны на паўднёва-ўсходнім слупе полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы. Графіці полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы з'яўляюцца каштоўнымі гістарычнымі пісьмовымі крыніцамі XII–XIX стст. Яны даюць звесткі па антрапаніміцы, прасапаграфіі, пісьменнасці людзей Сярэдневякоўя і Новага часу. Паўднёва-ўсходні слуп з'яўляецца адным з чатырох слупоў наоса. Ён знаходзіўся ў зоне даступнасці для ўсіх жадаючых пакінуць надпіс. На слупе з XII па XIX ст. з'яўляюцца памінальныя запісы, алфавіты, аўтографы, рысункі і надпісы-varia. Найбольш інтэнсіўна запоўнена надпісамі паўднёва-ўсходняя грань, што абумоўлена знаходжаннем тут царкоўнага кліраса. Два надпісы «крылас Святога Спаса» ўтрымліваюць эклезіонім. Ён абазначаў месцазнаходжанне клірашан падчас набажэнства і паказваў, як называлася царква ў штодзённым жыцці палачан.

*Ключавыя словы:* Спаса-Праабражэнская царква г. Полацка, графіці, эклезіонім, помнікі пісьменнасці.

The article considers the graffiti located on the south-eastern pillar of the Polotsk Transfiguration Church. The graffiti of the Polotsk Transfiguration Church are valuable historic written sources of the 12-19th centuries. They give information on anthroponymy, prosopography, written language of the people of the Middle Ages and Modern Times. The south-eastern pillar is one of the four pillars of the naos. It was located in the zone available for all those who wanted to leave an inscription. From 12th to 19th centuries, commemoration inscriptions, alphabets, autographs, drawings, and varia-inscriptions appear on the pillar. The south-western edge is the most filled with inscriptions which is preconditioned by the location of church kliros in this place. Two inscriptions “kliros of Holy Savior” contain an ecclesionym. It denoted the location of kliros during worshipping and showed the way the church was called in everyday life of Polotsk people.

*Keywords:* Polotsk Transfiguration Church, graffiti, ecclesionym, monuments of written language.

*Уводзіны.* Работа па даследаванні аўтарам графіці Спаса-Праабражэнскай царквы г. Полацка вядзецца з 2007 г. За гэты час у храме было знойдзена, прачытана і зафіксавана каля 4000 надпісаў, якія датуюцца часам ад XII да сярэдзіны XIX ст. Вывучэнне і аналіз надпісаў дазваляе вылучыць месцы, дзе з'яўленне графіці абумоўлена пэўнымі прычынамі. Сукупнасць графіці, прадрапаных на паўднёва-ўсходнім слупе, разглядаецца ўпершыню.

*Асноўная частка.* Полацкая Спаса-Праабражэнская царква, пабудаваная ў XII ст. прападобнай Еўфрасінняй Полацкай, прадстаўляе сабой шасцістоўпны храм. Два алтарныя слупы з'яўляюцца чатырохвугольнымі ў плане і выходзяць у наос толькі заходнімі гранямі. Васьмігранных слупоў у прасторы царквы чатыры: паўночна-ўсходні, паўночна-заходні, паўднёва-ўсходні і паўднёва-заходні. Усе яны даступныя для прадрапвання графіці падчас набажэнстваў і наведвання храма не толькі манахінямі, але і простымі людзьмі. Аднак надпісы на кожным са слупоў адрозніваюцца па тэматыцы і колькасці нанесеных графіці.

Паўднёва-ўсходні слуп знаходзіцца каля паўднёвага бакавога ўвахода з галерэі ў царкву, які раней лічыўся аркасоліям. Графіці нанесены на слуп нераўнамерна. Найбольш запоўненай з'яўляецца паўднёва-ўсходняя грань, якая непасрэдна глядзіць на паўднёвы выхад.

Вывучэнне графіці Спаса-Праабражэнскай царквы дало магчымасць стварыць класіфікацыю надпісаў па мэце іх нанясення на сцены. Вылучаюцца памінальныя запісы і спісы-сінодыкі, памінальныя рысачкі, малітоўныя прашэнні, алфавіты, рысункі, надпісы-varia, аўтографы, тэксты набажэнстваў. Да 1578 г. графіці запісваліся кірыліцай, пасля ў надпісах пераважае лацініца.

*Памінальныя запісы* – адна з самых змястоўных катэгорый надпісаў. Яны будуюцца па

«схеме»: месяца NN у NN дзень (або на памяць святога, святой ці царкоўнае свята) праставіўся (памёр) імя нябожчыка [1, с. 144]. Даволі часта ў такіх графіці да імя дадаецца сан або пасада чалавека, у выніку чаго мы можам даведацца пра вядомых гістарычных асоб, а таксама пра асоб, якія не згадваюцца больш ні ў якіх гістарычных крыніцах. У храме такога кшталту ў графіці згадваюцца ігуменні, святары, епіскапы. З усіх чатырох васьміграненных слупоў найбольшая колькасць памінальных графіці размешчана на паўночна-ўсходнім. На жаль, на паўднёва-ўсходнім слупе такія надпісы прадстаўлены вельмі сціпла. Яны знаходзяцца толькі на паўднёва-ўсходняй грані і з'яўляюцца фрагментарнымі. У адным з іх чытаюцца словы «поп Василеи», астатнія два – недапісаныя.

*Надпісы-сінодыкі* прадстаўлены на слупе толькі адным графіта, якое ўключае два імя: Данілка, Даміяна. Такія надпісы маглі б лічыцца аўтографамі, але яны стаяць у вінавальным склоне, што мае на ўвазе выкарыстанне іх у малітве: «памяні, Госпадзі, рабоў тваіх Данілка, Даміяна». Надпіс мог тычыцца як жывых людзей, якія пакідалі гэты запіс за сябе і блізкага чалавека, так і памерлых.

Найвялікшая колькасць *памінальных рысачак* знаходзіцца ў алтарнай частцы царквы. І гэта доволі добра тлумачыцца прызначэннем гэтых рысачак. Імі адзначалася колькасць малітваў, прачытаных за чалавека. Такія графіці могуць складацца з імя або адной літары імя, справа ад якіх гэтыя рысачкі ставіліся. Сустракаюцца таксама надпісы, якія змяшчаюць толькі рысачкі. Такога кшталту графіці ёсць і на трох гранях слупа: дзевяць на паўночнай, трынаццаць на паўднёвай, і дзве групы па трынаццаць рысачак змяшчаюцца на паўднёва-ўсходняй грані. Трэба адзначыць, што ў старажытнарускіх храмах такія рысачкі сустракаюцца толькі ў алтарнай частцы. У Спаса-Праабражэнскім храме яны змешчаны па ўсёй прасторы храма. Гэта можа быць звязана з тым, што чытанне малітваў маглі даручаць і манахіням.

*Малітоўныя прашэнні* ў храме прадстаўлены ў розных формах. Яны прадстаўляюць сабой звяртанне чалавека да Бога і змяшчаюць просьбу аб дапамозе. Самая ранняя «формула», па якой запісваюцца малітоўныя прашэнні: «Госпадзі, помозі рабу свайму (або рабе сваёй) (імя)». Пазней слова «помозі» – «дапамажы» замяняецца на «памяні», «спасі», «памілуй», а ў XVII ст. надпіс можа быць як на кірыліцы, так і на лацініцы. Сустракаюцца фрагментарныя і неахайныя графіці, дзе аўтар надпіса прапускае склады. Аднак наяўнасць дзвюх літар: ги пад цітлам заўсёды чытаецца як скарочанае слова «госпадзі» і паказвае на пачатак малітоўнага прашэння.

На слупе няма малітоўных прашэнняў, запісаных цалкам. Два фрагментарныя надпісы г҃и по – «госпадзі, помозі» і адзін з дзьвюма літарамі: г҃и ёсць на паўднёва-ўсходняй грані слупа. На паўднёвай грані знаходзіцца фрагментарны надпіс помяни ра, які можна прачытаць як «памяні ра(ба свайго) (або рабу сваю)». На той жа грані ёсць фрагментарнае графіта: помяни юже – «памяні якую», што можа быць скарачэннем малітвы за жывую або памерлую асобу жаноцкага пола. Яшчэ адзін фрагментарны надпіс можна трактаваць і як малітоўнае прашэнне, і як частку богаслужбовага тэкста: приими моле(ние мое). Дакладна гэтая частка надпісу ўваходзіць у пракімен, глас 4: «Господи, услыши молитву мою, приими моление мое».

На заходняй грані на лацініцы запісаны два фрагментарныя графіці: pomyn і pomy Hos. Гэта недапісаныя малітоўныя звароты да Бога. Яны датычацца памінання памерлых людзей і павінны чытацца як pomyn Hospody Rabou… Такія графіці характэрныя для XVII ст. Мы можам выказаць здагадку, што наносіліся яны ў перыяд пераасвячэння царквы ў 1654–1667 гг., калі ў царкве вяліся праваслаўныя набажэнствы, але надпісы, памінальныя, аўтографы і varia, ужо прадрапваліся на лацініцы. Такога кшталту графіці аднаўляюцца па надпісах, якія даволі добра і ў разгорнутым выглядзе захаваліся на паўночна-ўсходнім і паўднёва-заходнім слупах. Там пасля слоў pomyn Hospody Rabou… ідзе пералік імёнаў памерлых людзей. Падобныя спісы – сінодыкі існавалі і раней, але запісваліся яны на сценах царквы кірыліцай.

*Фрагменты набажэнстваў.* У прасторы царквы сустракаюцца фрагменты тэкстаў, якія чыталіся падчас набажэнстваў. Здаецца слушным, што гэтыя тэксты запісваліся па памяці [1, с. 144–145]. На слупах царквы найбольшая колькасць такіх тэкстаў знаходзіцца на паўночна-заходняй грані паўднёва-ўсходняга слупа. Магчыма, што ўсе гэтыя надпісы выканаў дыякан Мікіта: яго аўтограф упісваецца ў адно з дадзеных графіці. Першы надпіс фрагментарны, у першым радку чытаецца: Микита диакон, у другім о тебе радуется непорочная дево. Магчыма, аўтарам пераблытаны словы малітвы Іаана Дамаскіна: «О тебе радуется, Благодатная, всякая тварь». Наступны фрагмент графіта чытаецца як **услыши мя**. У адрозненні ад надпісаў у алтары і на паўночна-заходнім слупе, перад гэтымі словамі няма слоў «у панядзелак», што паказвала б на чытанне пракімна чацвёртага гласа: «Господь услышит мя, внегда воззвати ми к нему». Але ніжэй запісаны

пракімен гласа першага: твоя ги поженет мя, якая цалкам чытаецца як «И милость твоя, Господи, поженет мя вся дни живота моего», які чытаецца падчас набажэнства ў аўторак. Такім чынам, гэта пракімны чацвёртага і першага гласа, якія гучаць, адпаведна, у панядзелак і аўторак. У сувязі з гэтым даволі лёгка аднаўляецца і наступны фрагментарны радок: …вое спс мя и в силе як «Боже, во имя Твое спаси мя, и в силе Твоей суди ми». Такім чынам у графіці запісаны дзённыя пракімны на вячэрні, якія чытаюцца ў панядзелак, аўторак і сераду.

На ўсходняй грані запісаны фрагмент пачатку сціхіры на ліціі Святой Тройцы в пророцехъ въ… – «Во пророцех возвестил еси нам путь спасения, и во апостолехъ возсия, Спасе наш, благодать Духа твоего. Ты еси Бог первый, Ты и по сих, и во веки Ты еси Бог наш». Тэкст ліціі цалкам запісаны на ўсходняй грані паўночна-ўсходняга слупа, як бы ў люстэркавым адбітку адносна алтара.

*Надпісы-varia* – найбольш цікавая катэгорыя графіці. Іх каштоўнасць у тым, што яны самыя «жывыя» з усіх катэгорый надпісаў, запісваюцца не па «стандартнай формуле», прынятай у той час, напрыклад, «госпадзі, памозі» для малітоўных прашэнняў або ўзгадванне даты ці царкоўнага свята, а потым размяшчэнне інфармацыі пра памерлага чалавека ў памінальных запісах, а часцей за ўсё адлюстроўваюць эмоцыі і пачуцці чалавека, які пакінуў графіта.

З усіх чатырох слупоў найбольшая колькасць такіх надпісаў размешчана менавіта на паўднёва-ўсходнім слупе, а на ім пяць з дзевяці такога кшталту надпісаў знаходзяцца на паўднёва-ўсходняй грані.

Цікавае, але фрагментарнае графіта сведчыць аб падзеях другой паловы XVI ст. і перадачы манастырскіх земляў ордэну іезуітаў: тая церковь…(ц)аркве доста езовитам. Надпіс можна прачытаць як «тая царква (і тое, што ў ц)аркве дасталася іезуітам». Можна выказаць здагадку, што размова ідзе пра Спаса-Праабражэнскую царкву, хаця не толькі яна была аддадзена ордэну.

На тым жа слупе зафіксаваны надпіс: напилась на лаза(реву суботу). Магчыма, гэта пакаяльны надпіс самой жанчыны, а можа быць, асуджэнне з боку іншага чалавека. Дарэчы, самы «частотны» грэх, зафіксаваны ў графіці, – гэта п'янства. Яшчэ адзін надпіс на паўднёва-ўсходняй грані паўночна-заходняга слупа чытаецца як немочи и з помхелья. У апошнім слове літары «х» і «м» пераблытаны месцамі, магчыма з прычыны гэтага самага «пахмелля». У аркасоліі паўднёвай сцяны глыбока схавана на ўнутранай сцяне графіта, якое чытаецца: «Якаў прапіў кануны». Кануна́мі маглі называць і просфары з памінальнай службы, і саму памінальную ежу.

Аб прычынах з'яўлення такой вялікай колькасці графіці менавіта на паўднёва-ўсходняй грані паўднёва-ўсходняга слупа могуць сведчыць два надпісы, якія чытаюцца як: крылосъ Святого Спаса. Такім чынам, месцазнаходжанне кліраcан у гэтым месцы абумовіла вялікую колькасць надпісаў рознай тэматыкі.

З цікавых надпісаў, якія змяшчаюцца на тым жа слупе, можна адзначыць мянушку каня «Гнядок» на паўднёва-ўсходняй грані, недалёка ад выявы галавы каня, слова жажа – «смага» на паўднёвай грані, якое магло быць не толькі адзнакай стану чалавека, але і мянушкай чалавека, слова монахъ на заходняй грані, якое чалавек мог пісаць як пра сябе, так і пра іншага, і якое, магчыма, з'яўляецца незавершаным надпісам. На паўднёвай грані ёсць адзіны добрапажадальны надпіс: Спирид попъ добры, які накладаецца на выявы твараў у профіль [1, с. 147]. Звычайна надпісы, у якіх гаворыцца пра другіх людзей, павучальныя або змяшчаюць патрабаванне пакарання для вызначанага чалавека.

На той жа паўднёва-ўсходняй грані слупа ёсць два алфавітныя надпісы. Такія графіці пакідалі неафіты, людзі, якія толькі навучыліся пісаць. Безумоўна, яны дэманстравалі сваё ўменне. У адным з надпісаў тры літары: абв, у другім – восем: абвгдежз. Дарэчы, алфавіты сустракаюцца на іншых слупах храма, а таксама на хорах і ў алтары, дзе надпіс складаецца з 14 літар і з'яўляецца самым доўгім алфавітным надпісам у Спаса-Праабражэнскім храме [1, с. 143–144].

*Рысункі*, якія былі прадрапаны ў храме, прадстаўлены наступнымі катэгорыямі: антрапаморфныя, арнітаморфныя і зааморфныя выявы, выявы рук, пляцёнкі, крыжы, гербавыя выявы і ўласныя знакі, кругі. Антрапаморфныя выявы прадстаўлены дзвюма профілямі твараў людзей, якія знаходзяцца на паўднёва-заходняй грані паўднёва-ўсходняга слупа. Паверх рысункаў ёсць надпіс: «Спірыд – поп добры».

Выява конскай галавы і шыі знаходзіцца на паўночна-ўсходняй грані слупа. На ёй добра прадрапана вупраж. Магчыма, да гэтай выявы належыць прадрапаная мянушка жывёлы «Гнядок».

Арнітаморфная выява прадстаўлена выявай птушкі на паўднёва-ўсходняй грані. Яна прадстаўляе сабой спалучэнне птушынай галавы з прамавугольным целам і крыламі, прадрапанымі завостранымі лініямі.

На той жа грані ёсць выявы рук і перапляцення, падобнага на ўпрыгажэнні ў кнігах.

Адзін з самых распаўсюджаных сюжэтаў у рысунках-графіці – гэта крыжы. Верагодна, яна неслі сэнсавую нагрузку не толькі як сімвал хрысціянскай веры, але і як аналаг малітвы для непісьменнага чалавека. Выявы крыжа прадстаўлены простымі чатырохканцовымі і шасціканцовымі крыжамі, а таксама крыжамі-крослетамі, чатырохстароннімі, раўнабаковымі з патаўшчэннямі на канцах. Крослет прадрапаны на паўднёва-заходняй грані паўднёва-ўсходняга слупа. Большасць выяў крыжоў прадстаўлена на слупе галгофамі. Галгофскі крыж стаіць на прамавугольным узвышшы і можа суправаджацца надпісамі. Большасць крыжоў такога тыпу ў графіці паўднёва-ўсходняга слупа не суправаджаецца надпісамі, але часам ёсць фрагментарныя надпісы «ІС ХС НІКА» («Ісусам Хрыстом перамагай») і «ГГ» («гара Галгофа»). Найбольшая колькасць такіх выяў знаходзіцца на паўднёва-ўсходнім слупе: дзве на паўднёвай грані і шэсць на паўднёва-ўсходняй.

З гербавых знакаў мы можам убачыць на паўднёвай грані паўднёва-ўсходняга слупа Абданк і на паўднёва-ўсходняй грані двойчы прадрапаныя Калюмны. Звяртаюць на сябе ўвагу два знакі з той жа грані, якія былі ўтвораны на аснове галгофскіх крыжоў і нагадваюць трохвугольныя знакі з адгалінаваннямі на вядомым партрэце Скарыны.

Адна з самых шматлікіх катэгорый графіці – аўтографы, якіх да XVI ст. было няшмат і якія потым становяцца самымі масавымі з надпісаў [1, с. 143–144]. Так, на паўночна-заходнім слупе змяшчаюцца аўтографы на кірыліцы ў выглядзе імен, прозвішчаў і іх спалучэння: Перович, Василеи Козарски, Савати Ложински, Германъ, Ометка, Васил, Иван, Даниел, Савел. Ёсць больш поўны аўтограф, дзе чалавек запісаў: «Я Балтрумей ...лавович тут был». Цікавы надпіс, дзе чалавек пераставіў склады ў сваім імені і такім чынам «зашыфраваў» яго. Графіта телипанът, відавочна, трэба чытаць як імя «Пантелеи».

Найбольшую колькасць графіці складаюць аўтографы XVII ст. на лацініцы. Іх больш за трыццаць. Яны прадстаўлены імёнамі, прозвішчамі, спалучэннем у адным надпісе імя і прозвішча, манаграмамі. Частка надпісаў суправаджаецца датамі, частка датуецца па палеаграфічных прыкметах. Так, напрыклад, на ўсходняй грані знаходзіцца датаваны аўтограф Kristoph Strunk 1667, на паўночнай – Wiktor Ulanowski 1829, на паўднёвай – Martinus Kozlowski 1640 і Alexander Narbut 1717, на заходняй – Ian Baka 1626 і інш.

Некаторыя аўтографы паўтараюцца ў іншых частках храма. Так, аўтограф Karol Newelsky сустракаецца на паўночна-заходняй грані і ў дыяканніку, Alexander Slizien – на паўднёвай грані і ў паўднёвым кампартыменце. Але «рэкардсменам» па аўтографах з'яўляецца Heliasz Szewerdzic, які пакінуў каля дваццаці аўтографаў на сценах царквы, у тым ліку ў выглядзе фрагментаў, манаграм, спалучэння поўнага імя і прозвішча, скарочанага імя і прозвішча і г. д. Аўтографы гэтага чалавека былі запісаны прыблізна ў 1661 г., што зафіксавана ў графіта. У адным з графіта запісана і мэта, з якой Геліаш быў у царкве, – «за адпушчэннем сваіх грахоў», аб чым ён пакінуў надпіс на лацініцы вельмі тонка прадрапанымі, верагодна, іголкай літарамі, магчыма, таму, што не хацеў, каб хтосці ўбачыў яго пакаянны надпіс.

Аўтограф аднаго з воінаў-наёмнікаў, які прыйшоў з войскам Стэфана Баторыя: Iochim Sonebom, знаходзіцца на заходняй грані. Яго ж аўтограф побач з аўтографам сябра, Лудера Роннекена, ёсць у алтары. Іх аўтографы ёсць і на паўночным алтарным слупе, дзе спісам пакінулі свае аўтографы і іншыя наёмнікі.

Некаторыя аўтографы належаць гістарычным асобам, вядомым па іншым пісьмовым крыніцам. Такія надпісы ёсць у алтарнай частцы, у кампарціментах. Так, на паўднёва-заходняй грані пакінуў свой аўтограф Bazilius Swęcicky, які ў 1656–1657 гг. згадваецца як лаўнік, а ў 1709 г. як гадавы бурмістр, а ў 1727 г. як нябожчык [2, с. 173].

*Заключэнне.* Графіці полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы з'яўляюцца каштоўнымі гістарычнымі пісьмовымі крыніцамі XII–XIX стст. Яны даюць звесткі па антрапаніміцы, прасапаграфіі, пісьменнасці людзей Сярэдневякоўя і Новага часу. Размяшчэнне графіці ў царкве нераўнамернае, яно залежыць ад часткі царквы, у якой размяшчаліся надпісы. Так, у алтарнай частцы да другой паловы XVI ст. надпісы маглі наносіць толькі людзі, якія праводзілі набажэнствы. Верхні ярус, у які ўваходзілі хоры і кампартыменты, таксама быў даволі закрытай зонай да XIV ст. [3, с. 212]. У адрозненні ад гэтых мест у царкве, паўднёва-ўсходні слуп знаходзіўся ў зоне даступнасці для ўсіх жадаючых пакінуць надпіс. На слупе з XII па XIX ст. з'яўляюцца памінальныя запісы, алфавіты, аўтографы, рысункі і надпісы-varia. Найбольш інтэнсіўна запоўнена надпісамі паўднёва-ўсходняя грань, што абумоўлена знаходжаннем тут царкоўнага кліраса. Аб гэтым непасрэдна сведчаць два надпісы «крылас Святога Спаса», якія не толькі абазначаюць месцазнаходжанне клірашан падчас набажэнства, але і ўтрымліваюць эклезіонім, які паказвае, як называлася царква ў штодзённым жыцці палачан.

*Літаратура*

1. *Калечиц, И. Л.* Граффити Спасо-Преображенской церкви: хронология и локализация по результатам работ 2012–2019 гг. / И. Л. Калечиц // Спасо-Преображенский храм в г. Полоцке: вопросы изучения и реставрации : материалы международной науч.-практ. конф., Полоцк 17–18 сентября 2019 г. / Полоцкий Спасо-Евфросиниевский женский монастырь в Полоцке. – Полоцк : Полоцкое книжное издательство, 2022. – С. 143–161.
2. *Макараў, М. Д.* Месцкія ўлады Полацка (1580–1772): арганізацыя, персанальны склад / М. Д. Макараў. – Смаленск : Інбелкульт, 2014. – 197 с.
3. *Калечиц, И. Л.* Корпус граффити полоцкой Спасо-Преображенской церкви: южная келья / И. Л. Калечиц. – Минск : БГПУ, 2020. – 248 с.

*References*

1. *Kalechic, I. L.* Graffiti Spaso-Preobrazhenskoj cerkvi: hronologiya i lokalizaciya po rezul'tatam rabot 2012–2019 gg. / I. L. Kalechic // Spaso-Preobrazhenskij hram v g. Polocke: voprosy izucheniya i restavracii : materialy mezhdunarodnoj nauch.-prakt. konf., Polock 17–18 sentyabrya 2019 g. / Polockij Spaso-Evfrosinievskij zhenskij monastyr' v Polocke. – Polock : Polockoe knizhnoe izdatel'stvo, 2022. – S. 143–161.
2. *Makaraŭ, M. D.* Mesckiya ŭlady Polacka (1580–1772): arganizacyya, persanal'ny sklad / M. D. Makaraŭ. – Smalensk : Inbelkul't, 2014. – 197 s.
3. *Kalechic, I. L.* Korpus graffiti polockoj Spaso-Preobrazhenskoj cerkvi: yuzhnaya kel'ya / I. L. Kalechic. – Minsk : BGPU, 2020. – 248 s.